УДК [61+615.1] (06)
ББК 5+52.81
А 43
ISBN 978-985-21-1865-1


***Д.А. Санюк***

# ВЫЗВАЛЕННЕ ВЁСКІ АЗЯРАНЫ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: УДАКЛАДНЕННЕ ДАДЗЕНЫХ АБ ЗАГІНУЎШЫХ ВОІНАХ

***Навуковы кіраўнік: ст. выкладч. П.Ю. Малчанаў***
*Кафедра філасофіі і паліталогіі з курсам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

***D.A. Sanyuk***

# THE LIBERATION OF THE VILLAGE OF AZYARANY IN THE GREAT PATRIOTIC WAR: CLARIFICATION OF DATA ON SOLDIERS WHO DIED

***Tutor: senior lecturer P.Y. Malchanau***
*Department of Philosophy and Political Science with a Professional Development and Retraining Course*
*Belarusian State Medical University, Minsk*

**Рэзюме.** Удакладняюцца дадзеныя аб загінуўшых воінах падчас вызвалення вескі Азяраны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На падставе звестак з Пермскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі і вусных пасведчанняў родных, прасочваецца лёс Міхаіла Фёдаравіча Гарбунова, імя якога памылкова з'явілася на мемарыяльнай пліце ў весцы Азяраны.
**Ключавыя словы:** архіўныя звесткі, мемарыяльная пліта, Азяраны, Міхаіл Фёдаравіч Гарбуноў.
**Resume**. The data on the soldiers who died during the liberation of the village of Azyrany during the Great Patriotic War are being clarified. Based on information from the Perm State Archive of Socio-Political History and oral testimonies of relatives, the fate of Mikhail Fedorovich Gorbunov, whose name mistakenly appeared on the memorial plaque in the village of Azyrany, is being traced.
**Keywords:** archival records, memorial plaque, Ozerany, Mikhail Fedorovich Gorbunov.

**Актуальнасць.** Беларусь заплаціла жахлівую цану за перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне – мільёны загінуўшых падчас карных аперацый, бамбардзіровак і масавых расстрэлаў, спаленыя вёскі, зніклыя сем'і. Але за вялікай лічбай стаяць канкрэтныя лёсы, імёны, гісторыі. У гэтым кантэксце асаблівую значнасць набывае вывучэнне мясцовай ваеннай гісторыі.

Паводле звестак з архіўных дакументаў, Тураўскі раён быў акупаваны ў жніўні 1941 года і знаходзіўся пад акупацыяй да 5 ліпеня 1944 года [1, с. 2304–2308]. Увесь гэты час нямецка-фашысцкія захопнікі жорстка здзекваліся з мірнага насельніцтва. Вёска Азяраны, якая ўваходзіла ў склад Тураўскага раёна, захавала памяць пра трагічныя падзеі тых гадоў. На яе тэрыторыі знаходзіцца Брацкая магіла і мемарыяльная пліта з прозвішчамі воінаў-вызваліцеляў вёскі. Але многія з іх да гэтага часу застаюцца без дакладна высветленых біяграфічных звестак. Таму ўдакладненне дадзеных аб загінуўшых воінах з'яўляецца значным унёскам у вывучэнне ваеннай гісторыі Тураўшчыны і спрыяе захаванню гістарычнай памяці і праўды аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі.

УДК [61+615.1] (06)
ББК 5+52.81
А 43
ISBN 978-985-21-1865-1


**Мэта:** удакладненне дадзеных аб загінуўшых воінах, якія вызвалялі вёску Азяраны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, чые імёны выбіты на мемарыяльнай пліце Брацкай магілы.

**Задачы:**

1. Удакладніць дадзеныя адносна імёнаў байцоў-вызваліцеляў, якія памылкова выбіты ці не значацца на мемарыяльнай дошцы ў вёсцы Азяраны.
2. Высветліць сапраўдны лёс чырвонаармейца М. Ф. Гарбунова на аснове архіўных звестак і вусных пасведчанняў яго сястры.

**Матэрыялы і метады.** Даследаванне праводзілася на аснове звестак з Пермскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі. Выкарыстоўваліся інтэрнэт-рэсурсы, такія як сайты “Памяць народа” і “Подвиг народа”. Праводзіўся пошук кантактаў родных загінуўшых з дапамогай пошукавых груп. Сістэматызацыя матэрыяла ажыццяўлялася шляхам выкарыстання гісторыка-генетычнага і гісторыка-параўнальнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На мемарыяльнай пліце Брацкай магілы ў вёсцы Азяраны выбіта 280 імён загінуўшых салдат. У прыватнасці, на дадзенай пліце значыцца імя Гарбуноў Міхаіл Фёдаравіч, ураджэнец Пермскага краю (мал. 1).



**Мал. 1** – Гарбуноў Міхаіл Фёдаравіч

Згодна звестак інтэрнэт-сайта “Память народа”, у 1944 годзе Гарбуноў Міхаіл Фёдаравіч загінуў [2] (мал. 2). Інфармацыя сайта “Подвиг народа” сведчыць аб тым, што яго ўзнагародзілі за бой у Азяранах у 1947 годзе, а пасля вайны ён працаваў у калгасе пажарнікам [3] (мал. 3).

УДК [61+615.1] (06)
ББК 5+52.81
А 43
ISBN 978-985-21-1865-1




НКО—СССР
= 117 =
Стрелковый Полк
23 марта 44 г.
ИЗВЕЩЕНИЕ
№ 012
Ваш муж, красноармеец, сапер 117 стрелкового полка
Горбунов Михаил Федорович
уроженец Молотовская обл. Куединский р-н.
в бою за социалистическую Родину, верный воинской присяге, проявив геройство и мужество, был убит 23 марта 1944 года
похоронен БССР, Полесская область, Туровский р-н. село Буда
Настоящее извещение является документом для возбуждения ходатайства о пенсии (приказ НКО СССР №________)
Командир части
Начальник штаба
М. П.
ЦТ НКО. 606—43

**Мал. 2** – Апавяшчэнне аб гібелі Гарбунова М.Ф. 23 сакавіка 1944 года, якое атрымала яго жонка (звесткі з сайта “Память народа”)


Все графы заполнять полностью.
НАГРАДНОЙ ЛИСТ
1. Фамилия, имя и отчество Горбунов Михаил Федорович
2. Звание Красноармеец 3. Должность, часть сапер 117 сп. 25 сд. 2-й белорусский фронт работает пожарником в колхозе в к-зе 15-Октябь
Представляется к ордену "Красная Звезда".
4. Год рождения 1910 5. Национальность Русский 6. Партийность беспартийный
7. Участие в гражданской войне, после дующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) с июня 1943г. по март 1944г. 2-й белорусский фронт 117 сп. 25 сд. 2-й белорусский фронт.
8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне одно тяжелое ранение 20 марта 1944г. 117 сп. 25 сд. 2-й белорусский фронт.
9. С какого времени в Красной Армии с июня 41г. по ноябрь44 10. Каким Р.В.К. призван Куединским Райвоенкоматом, Молотовской области.
11. Чем ранее награжден (за какие отличия) "За победу над Германией"
12. Постоянный домашний адрес
I. Краткое конкретное изложение личного подвига или заслуг
Бывший красноармеец стрелок 117 сп. 25 сд. Горбунов Михаил Федорович в боях отечественной войны с июня 1941г. по март 1944г. в должности стрелка.
Будучи стрелком в составе 117 сп. 25 сд. во время наступления частей 2-го белорусского фронта 20 марта 1944г. был тяжело ранен осколком мины в левую ногу с повреждением кости. В результате ранения отсутствует левая нижняя конечность на уровне трети бедра, является инвалидом отечественной войны 2-й группы, в настоящее время работает пожарником в колхозе 15-й октябрь, к работе относится добросовестно. Товарищ Горбунов Михаил Федорович по ранению достоин награждения орденом "Красная Звезда".
Райвоенком майор а/с. (Сазонкин)
Секретарь Куединского РК ВКП(б) (Бурдин)
„10“ июля 1947 г.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| 125 | Гудин Виктор Степанов. | | 26.07.41 | демоб. |
| 126 | Григорьев Петр Алексеевич | 1914 | — " — | проп. б/вести в феврале 43 г. |
| 127 | Гараев Бадыр | | — " — | демоб. в 45 г. |
| 128 | Глухов Федор Фролович | | — " — | демоб. |
| 129 | Глухов Кузьма Григорьевич | | — " — | проп. б/вести в апреле 43 г. |
| 130 | Гагарин Иван Егорович | | — " — | демобилиз. |
| 131 | Глазырин Ефим Степанович | 1908 | — " — | проп. б/вести в июле 42 г. |
| 132 | Гудин Алексей Савельевич | | — " — | демоб. в 45 г. |
| 133 | Гостев Прокор Карпович | | — " — | демобилиз. |
| 134 | Галиев Газизян | | — " — | демоб. в 45 г. |
| 135 | Горбунов Михаил Федорович | | — " — | прибыл по ранению |
| 136 | Гагарин Федор Федорович | | — " — | демобил. |
| 137 | Глухов Павел Тимофеевич | | — " — | проп. б/вести в июне 44 г. |
| 138 | Глебов Андрей Васильевич | | — " — | умер 22.01.45 г. |
| 139 | Галиабборов Валят | | — " — | демоб. в 45 г. |
| 140 | Гильманшин Гильматдин | | — " — | уволен по ранению в 49 г. |
| 141 | Гарипов Фатих | 1913 | 3.08.41 | офицер запаса |
| 142 | Гадзаров Зари | 1906 | — " — | проп. б/вести в октябре 42 г. |
| 143 | Гариев Садит | 1908 | — " — | погиб |
| 144 | Гараев Газ | | 12.08.41 | демобил. |
| 145 | Гадиятов Идият | (1915) 1911 | 17.08.41 | демоб. в 45 г. |
| 146 | Гамахматов Сагат | 1905 | — " — | демобилиз. |
| 147 | Грачков Федот Ефремович | 1907 | — " — | проп. б/вести в октябре 41 г. |
| 148 | Гущин Александр Дмитриевич | | 23.08.41 | убит 12.04.42 г. |
| 149 | Горбунов Алексей А. | | — " — | демоб. в 45 г. |
| 150 | Глухов Василий Фр. | | — " — | проп. б/вести в декабре 41 г. |
| 151 | Глухов Михаил К. | | — " — | умер в плену. |
| 152 | Горожанинов Михаил Ив. | 1916 | — " — | погиб |
| 153 | Горбунов Степан Фед. | | — " — | |
| 154 | Глухов Карп Дав. | 1913 | — " — | погиб |
| 155 | Глазырин Василий Степан. | | — " — | проп. б/вести |

**Мал. 3** – Узнагародны ліст Гарбунову М.Ф. у 1947 годзе (злева) і спіс выжыўшых салдат, у якім значыцца Гарбуноў М.Ф. (справа) (звесткі з сайта “Подвиг народа”)

Каб удакладніць гэтыя супярэчлівыя дадзеныя, быў зроблены запыт у Пермскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. З дапамогай пошукавай групы з горада Магілёва былі знойдзены кантакты пляменніцы Міхаіла Фёдаравіча Валянціны Гарбуновай, якая расказала, што яе дзядзька сапраўды вярнуўся дадому восенню 1944 года без нагі і пасля доўгага лячэння ў шпіталі.

З яе слоў, Міхаіл Фёдаравіч успамінаў сакавік 1944 года (вызваленне вёскі Бечы) так: “Бой быў страшны, фашысты абстрэльвалі нас с грамат, выбухі, крыкі…Снарад узарваўся побач. Адчуў моцны боль у назе, як аказалася пазней, яе адарвала вышэй калена. З апошніх сіл папоўз у бок будынка, які цудам уцалеў. Калі

ўсё скончылася, пачалі збіраць параненых. Мяне ж палічылі мёртвым, бо раны былі страшнымі…" Пасля вайны ў яго нарадзілася двое дзяцей. У 1947 годзе ён быў узнагароджаны Ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Памёр Міхаіл Фёдаравіч у 1980 годзе.

На падставе знойдзеных дадзеных настаўніцай Азяранскай сярэдняй школы Хвасцянок Аленай Мікалаеўнай быў падрыхтаваны артыкул "Ён пабываў у Брацкай магіле" ў газету "Новае Палессе" [4, с. 16].

У ходзе даследавання знойдзены яшчэ 15 імёнаў загінуўшых салдат, якія памылкова значацца на мемарыяльнай дошцы Брацкай магілы, 30 імёнаў, якія не значацца на магіле, імёны 2 вызваліцеляў не высветлены.

**Вынікі.** Даследаванне паказала, што на мемарыяльнай пліце ў вёсцы Азяраны ёсць памылковыя імёны загінуўшых, у тым ліку Міхаіла Фёдаравіча Гарбунова, які на самой справе выжыў. Было выяўлена 15 памылковых імёнаў, 30 адсутных і 2 невядомыя асобы, якія ўдзельнічалі ў вызваленні вёскі. Гэта падкрэслівае неабходнасць удакладнення інфармацыі і ўшанавання памяці ўсіх герояў.

**Літаратура**

1. Санюк Д. А., Злачынствы нямецкіх акупантаў на тураўшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны / Санюк Д. А // «Фундаментальная наука в современной медицине – 2024»: сборник материаловнаучно-практической конференции студентов и молодых ученых «Фундаментальная наука в современной медицине – 2024» / под. ред. С.П. Рубниковича, В.А. Филонюка –Минск : БГМУ, 2024 – с. 2304-2308.
2. Память народа [Электронный ресурс] / Минобороны России. – Электрон. дан. – М.: Министерство обороны РФ, 2007–2025. – Режим доступа: https://pamyat-naroda.ru/heroes/ (дата обращения: 28.05.2025).
3. Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг. [Электронный ресурс] / Минобороны России. – Электрон. дан. – М.: Министерство обороны РФ, 2007–2025. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/ (дата обращения: 28.05.2025).
4. Хвастянок А. М. Ён пабываў у Брацкай магіле // Новае Палессе. – 2025. – 26 лютага. – С. 16. – (Раздзел: Далёкае – блізкае. Імёны на граніце).